За два пасляваенныя гады адбыліся некаторыя змяненні ўдзельнай вагі асобных тавараў у агульным аб'ёме рознічнага тавараабароту. Удзельная вага гарэлкі і вінна-гарэлачных вырабаў у 1947 годзе паменшылася да 39,5 % супраць 63,0 у 1945 годзе (да вайны — 15,2 %). Павялічыўся продаж хлебабулачных вырабаў, цукру, малака, яек і іншых прадуктаў. Да канца 1947 года ўдзельная вага прамысловых тавараў у абароце вырасла да 38,3 %[14]. Разам з тым паўсюдна наглядаліся перабоі ў забеспячэнні таварамі першай неабходнасці — соллю, запалкамі, газай. Асноўнымі прычынамі гэтага становішча з'яўляліся як нястача рыначных фондаў, так і транспарту для дастаўкі тавараў.

Прынятыя партыяй і ўрадам энергічныя меры па пашырэнню сферы дзейнасці спажывецкай кааперацыі дазволілі ўстойліва павялічваць аб'ём тавараабароту і выконваць планавыя заданні. Так, у 1945 годзе аб'ём кааператыўнага гандлю склаў 1027,3 млн рублёў, а ў 1947 годзе — 2785,8 млн рублёў. Выкананне гадавых заданняў адпаведна склала 139,7 %, 109,7 %[15]. Нягледзячы на значныя намаганні па аднаўленню і развіццю рознічнай гандлёвай сеткі, яе агульны ўзровень да канца даследуемага перыяду не дасягнуў даваеннага, а колькасны рост матэрыяльнай базы і яе якасны стан адставалі ад росту аб'ёму рознічнага тавараабароту.

[1] Гл.: 40 лет Советской потребительской кооперации. 1917—1957 г. М., 1957. С. 90; ЦДАКР БССР. Ф. 332, воп. 5, спр. 255а, Л. 2.
[2] Гл.: ЦДАКР БССР. Ф. 332, воп. 5, спр. 2, л. 69.
[3] Там жа. Спр. 158, л. 1.
[4] Там жа. Спр. 12, л. 191—192.
[5] Гл.: Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР (на 1946—1950 гг.). Мінск, 1946. С. 27.
[6] ЦДАКР БССР. Ф. 7, воп. 3, спр. 1226, л. 11.
[7] Гл.: Сборник правительственных постановлений и ведомственных указаний о кооперативной торговле в городах и поселках. Вып. 1. М., 1947. С. 3 і далей.
[8] Гл.: О мероприятиях по развертыванию кооперативной торговли в городах и поселках БССР продовольственными и промышленными товарами и увеличению производства продовольствия и товаров широкого потребления копеperативными предприятиями и местной промышленностью БССР. Постановление Совета Министров и Центрального Комитета КП(б)Б. Минск, 1946. С. 13 і далей.
[9] ПА Гомельскага АК КПБ. Ф. 144, воп. 13, спр. 10, л. 240.
[10] Там жа. Воп. 1, спр. 80, л. 39—40.
[11] ЦДАКР БССР. Ф. 332, воп. 5, спр. 255а, л. 8, 12.
[12] Там жа. Спр. 26, л. 219.
[13] Там жа. Спр. 168, л. 151, 166.
[14] Там жа. Спр. 255а, л. 19.
[15] Там жа. Л. 5.

С. Б. ЖАРКО

## ФАРМІРАВАННЕ ПАТРЫЯТЫЗМУ І ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМУ Ў МАЛАДЫХ РАБОЧЫХ ПРАЦОЎНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР У IX ПЯЦІГОДЦЫ

Заснавальнікі навуковага камунізму К. Маркс і Ф. Энгельс у рабоце «Нямецкая ідэалогія» указвалі, што «гісторыя ёсць не што іншае, як паслядоўная змена асобных пакаленняў, кожнае з якіх выкарыстоўвае матэрыялы, капіталы, прадукцыйныя сілы, перададзеныя яму ўсімі папярэднімі пакаленнямі...»[1]. Перадача станоўчага вопыту, набытага як усім чалавецтвам, так і непасрэдна папярэднім пакаленнем, складае важны напрамак ідэйна-выхаваўчай работы.

Пераемнасць, захаванне і прымнажэнне рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый камуністычнай партыі і савецкага народа становіцца ўсё больш узрастаючай па сваім значэнні праблемай выхаваўчага працэсу.

У. І. Ленін заклікаў беражліва захоўваць і развіваць «...прывычкі, навыкі, перакананні, якія рабочы клас выпрацоўваў сабе на працягу многіх дзесяцігоддзяў у барацьбе за палітычную свабоду, каб уся сума гэтых прывычак, навыкаў і ідэй паслужыла сродкам выхавання ўсіх працоўных...»[2]

У перыяд, калі краіна праводзіць рэвалюцыйныя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, асаблівае месца належыць працоўным вытворчым ка-

лектывам, што ва ўмовах удасканалення сацыялізму выступаюць у якасці таго сацыяльнага мікраасяроддзя, у якім непасрэдна ўвасабляюцца ў жыццё палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і духоўныя ўстаноўкі нашага грамадства, умацоўваюцца ідэалы і этычныя нормы, складваюцца эталоны сацыяльнай дзейнасці і паводзіны людзей.

У IX пяцігодцы партыйныя і грамадскія арганізацыі прамысловых прадпрыемстваў Беларусі, выкарыстоўваючы самыя разнастайныя формы і сродкі, імкнуліся павысіць працоўную актыўнасць, ідэйнае выхаванне маладых рабочых. У гэтай рабоце наглядным праяўленнем патрыятызму і інтэрнацыяналізму, іх рухаючай сілай стала сацыялістычнае спаборніцтва. Маладыя рабочыя канкрэтнымі справамі, штодзённай работай даказвалі любоў да Радзімы, умацоўвалі яе магутнасць. Яны выступілі ініцыятарамі патрыятычнага руху «Пяцігодцы — ударную працу, майстэрства і пошук маладых», у якім прынялі ўдзел звыш 1 млн. юнакоў і дзяўчат [3].

«Мы па заслугах ацэньваем сёння, — падкрэслівалася на X Пленуме ЦК КПБ, — вялікі працоўны і творчы ўклад у выкананне планаў пяцігодкі камсамольцамі і моладдзю мінскіх заводаў імя Арджанікідзе, аўтамабільнага і трактарнага, Полацкага нафтаперапрацоўчага і Брэсцкага электралямпавага заводаў, камбінатаў «Беларуськалій» і Гродзенскага хімічнага імя С. В. Прытыцкага, «Лаўсанбуд» г. Магілёва» [4].

Шырокі размах набыла ініцыятыва прыйсці на дапамогу таварышу: «Выканаў пяцігодку сам — дапамажы датэрмінова выканаць таварышу». Маладыя энтузіясты дапамагалі таварышам авалодваць перадавым вопытам, удасканальваць прафесійнае майстэрства, выхоўвалі павагу да звання майстра, умельца. У 1975 годзе, калі краіна, усё прагрэсіўнае чалавецтва адзначала 30-годдзе Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй, у рэспубліцы атрымала масавае распаўсюджанне патрыятычная ініцыятыва масквічоў змагацца за датэрміновае выкананне планавых заданняў: «За сябе і за таго хлопца». У гэтых працоўных справах ярка праявілася пераемнасць, жывая сувязь пакаленняў, глыбокае засваенне вопыту бацькоў.

У 1971 — 1975 гадах сацыялістычнае спаборніцтва за выкананне пяцігадовага плана ахапіла не толькі асобных рабочых, працоўныя калектывы, але і рэспублікі. Міжрэспубліканскае спаборніцтва ўмацоўвала сяброўскія сувязі працоўных калектываў, садзейнічала інтэрнацыянальнаму выхаванню маладых рабочых. Добрай традыцыяй стала спаборніцтва працоўных дзвюх суседніх рэспублік — Беларусі і Літвы, калектываў аднародных прадпрыемстваў: Мінскага, Харкаўскага, Валгаградскага трактарных заводаў, аўтазаводаў Мінска, Масквы і Крэмянчуга, Бабруйскага машынабудаўнічага завода імя У. І. Леніна і Сумскага помпавага завода.

Працоўныя калектывы Беларускай ССР выступілі ініцыятарамі многіх каштоўных пачынанняў, накіраваных на выпуск найбольшай колькасці прадукцыі пры найменшых працоўных і матэрыяльных затратах. Усе гэтыя ініцыятывы садзейнічалі патрыятычнаму выхаванню рабочай моладзі, разуменню таго, што паляпшэнне працы, эканомія сыравіны павышаюць эканамічную і абаронную магутнасць краіны.

Важнае значэнне для патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання маладых працоўных рэспублікі меў рух настаўніцтва, ініцыятарамі якога выступілі кадравыя рабочыя мінскага станкабудаўнічага завода імя С. М. Кірава, што звярнуліся да ўсіх рабочых рэспублікі з заклікам «перадаць свае навыкі і вопыт аднаму-двум рабочым-навічкам, па-бацькоўску сустрэць новую змену на прадпрыемствах»[5].

Партыйныя арганізацыі прамысловых прадпрыемстваў БССР паклапаціліся аб тым, каб вялікая і высакародная справа выхавання моладзі была даручана людзям аўтарытэтным, палітычна адукаваным, з багатым жыццёвым вопытам і прафесійным майстэрствам. Менавіта так падыходзілі ў дзевятай пяцігодцы да кіраўніцтва патрыятычным рухам настаўніцтва ў калектывах мінскіх трактарнага і аўтамабільнага заводаў, завода электравылічальных машын, «Гомсельмаша», Полацкага нафтаперапрацоўчага завода, Гродзенскага завода карданных валаў і многіх іншых. Да канца 1975 года ў Беларусі настаўніцтва аб'ядноўвала больш чым 43 тысячы перадавых рабочых, якія шэфствавалі над 80 тысячамі маладых рабочых [6]. Вялікае выхаваўчае ўздзеянне на маладых рабочых аказвалі (што стала ўжо традыцыяй у многіх працоўных калектывах рэспублікі) урачыстае пасвячэнне моладзі ў рабочыя, працоўныя юбілеі, ушаноўванне рабочых дынастый.

У сацыялістычным спаборніцтве эканоміка і палітыка, праца і выхаванне маладых рабочых у калектыве арганічна звязаны і ўзаемна абумоў-

лены. Сістэма ідэалагічнай работы партыі заклікана арганічна спалучаць камуністычную ідэалогію з практычнай дзейнасцю мас. Працоўныя калектывы, дзе працуюць маладыя рабочыя, і з'яўляюцца той першай сацыяльнай ячэйкай, дзе перакрыжоўваюцца, пераплятаюцца розныя формы і сродкі ідэалагічнай работы, якія ўмоўна можна падзяліць на дзве групы: сродкі масавай інфармацыі (газеты, часопісы, радыё, тэлебачанне) і вусныя формы прапаганды ў самім калектыве (сістэма партыйнай і камсамольскай вучобы, лекцыі, даклады, тэматычныя вечары і г. д.).

Вялікія магчымасці для ўдасканалення патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання заключаны ў арганізацыі і правядзенні памятных гістарычных дат савецкага народа. У 1972 годзе, калі савецкі народ адзначаў 50-годдзе ўтварэння СССР, уся работа па падрыхтоўцы і правядзенню гэтага свята ў працоўных калектывах Беларусі праходзіла пад знакам умацавання дружбы брацкіх народаў, узмацнення працоўнай і грамадскай актыўнасці працоўных.

Хоць у 1971—1975 гадах у патрыятычным і інтэрнацыянальным выхаванні маладога пакалення рабочага класа рэспублікі выкарыстоўваліся разнастайныя формы і метады, аднак многія пытанні выхаваўчага працэсу апынуліся ў палоне бюракратычных метадаў работы грамадскіх арганізацый. Замест жывой справы нярэдка — засядацельская або папяровая кругаверць, замест адкрытага шырокага кантакту з моладдзю — пампезныя мерапрыемствы, гучныя рапарты, надуманыя пачыны. Часта недаацэньвалася роля індывідуальнай работы ў палітычным, ідэйна-маральным выхаванні, не раскрывалася адзінства інтарэсаў чалавека, калектыву і грамадства.

У даследуемы перыяд многія камітэты камсамола, спраўна складаючы справаздачы па палітвучобе і лекцыйнай прапагандзе, Усесаюзным паходзе і спаборніцтвах ГПА, па сутнасці не ўнікалі ў змест ідэйна-выхаваўчага працэсу. Адрыў ад жыцця, шкалярства, паўтор прапісных ісцін прывялі да таго, што формы гэтай работы не прыцягвалі, а адштурхоўвалі моладзь. Гэта цалкам адносіцца і да іншых грамадскіх арганізацый, што ў многім было звязана з агульным становішчам у краіне, з атмасферай застою.

Камітэты камсамола, прафсаюзы, ДТСААФ і іншыя грамадскія арганізацыі рэспублікі не даацэньвалі пытанні фарміравання гістарычнай свядомасці моладзі, прыніжалася ўвага да выхавання ў працоўнай моладзі любві да гісторыі роднага горада, рэспублікі, гістарычных і культурных помнікаў свайго народа, нацыянальных традыцый.

Аднак негатыўныя з'явы ў патрыятычным і інтэрнацыянальным выхаванні не даюць права на песімізм. Выступаючы на XX з'ездзе ВЛКСМ, М. С. Гарбачоў адзначыў: «Уся гісторыя нашай сацыялістычнай Радзімы пацвярджае найглыбейшую сувязь патрыятызму з інтэрнацыяналізмам. Мы літаральна выпакутавалі такое разуменне патрыятызму, як непрымірымае адмаўленне нацыяналізму, шавінізму, расізму.

Чалавек не нараджаецца з генамі інтэрнацыяналіста або нацыяналіста. Ад яго самога, ад выхавання, ад грамадства залежыць, якім ён стане ў жыцці. І кожнаму новаму пакаленню савецкіх людзей трэба будзе кожны раз зноў набываць пачуццё інтэрнацыяналізму ў міжнацыянальных зносінах, сумеснай вучобе і ў рабоце»[7].

[1] Маркс К., Энгельс Ф. Соч. Т. 3. С. 44—45.
[2] Ленін У. І. Творы. Т. 31. С. 338.
[3] Знамя юности. 1973. 13 апр.
[4] Советская Белоруссия. 1973. 18 мая.
[5] Деятельность партийных организаций Белоруссии по идейно-политическому воспитанию трудящихся. Минск, 1973. С. 121.
[6] Гл.: Комсомольская правда. 1988. 24 февр.
[7] Политическое самообразование. М., 1987. С. 17.

И. А. БИКУЛЬЧЮС

## ПОДПОЛЬНАЯ ПЕЧАТЬ КОМПАРТИИ ЛИТВЫ В ГОДЫ ФАШИСТСКОЙ ДИКТАТУРЫ (1927—1940)

В создании Компартии Литвы и борьбе за утверждение идей марксизма-ленинизма в революционном рабочем движении края большую организационную и пропагандистскую роль сыграла партийная периодическая пе-